# ДЫЗАЙН КНІГІ

***Васюк Тамара Іванаўна,*** *дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускага саюза мастакоў;*
***Васюк Уладзімір Уладзіміравіч,*** *дацэнт кафедры графічнага дызайну Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтва, сябра Беларускага саюза мастакоў*

Цэласны, завершаны вобраз кнігі ствараецца мастаком у суладдзі з пісьменнікам. Мастацкі вобраз кнігі складаецца з многіх кампанентаў, якія кожны раз ужываюцца ў асаблівых спалучэннях тону, шрыфту, прапорцый вокладкі, фармату аркушаў і іншых элементаў, што адпаведна характарызуе і вызначае індывідуальнасць мастака.

Чалавецтва заўсёды занатоўвае інфармацыю ў формах, адпаведных часу: наскальныя малюнкі; пісьмо на бяросце, гліняныя кнігі; рукапісы на пергаміне, паперы; фаліянты ў скураных абкладах з каштоўных металаў і камянёў і г. д. Трапяткі вобраз кнігі праз стагоддзі даносіць да нас не толькі тэкставую інфармацыю, але і эмацыйную. Славуты Францыск Скарына пакінуў нашчадкам узорныя прыклады мастацтва кнігі, дзе ўсё гарманічна і прыгожа.

Прадаўжальнікамі багатых і шматвяковых традыцый беларускага мастацтва кнігі Беларусі з'яўляюцца і сучасныя мастакі-графікі Уладзімір Вішнеўскі, Уладзімір Васюк, Валерый Славук, Вячаслаў Валынец, Уладзімір Малахаў, якія падрыхтавалі да Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры" выставу сваіх найлепшых творчых прац. Мастакі дэманстравалі аўтарскія аркушы і арыгіналы кніжных ілюстрацый, а таксама аздобленыя імі кнігі. Прадстаўленыя работы яскрава падкрэслівалі стыль і мастацка-вобразнае рашэнне кожнага з аўтараў.

Сучасным класікам у афармленні беларускай кнігі з'яўляецца Валерый Славук. Яго вобразы да беларускіх народных казак запамінальныя, пластычныя, дакладныя ў трактоўцы дэталяў. Узровень прафесіяналізму мастака адзначаны на многіх саюзных і міжнародных конкурсах кнігі. В. Славук – лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі 1993 г. На выставе прадстаўлены ілюстрацыі да кнігі Уладзіміра Ягоўдзіка "Жывая вада" (1996, папера, акварэль, гуаш). Валерый Славук – дацэнт кафедры графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў [1].

Комплексны падыход да афармлення кніг вызначаны ў серыі "Нашы духоўныя каштоўнасці", ідэя стварэння якой належыць мастаку Уладзіміру Васюку. Стылёвае афармленне вокладкі, тытульнага аркуша, шрыфтавых і фотадакументальных элементаў аб'яднаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў адзінае цэлае. Кнігі “Крыж Ефрасінні Полацкай”, “Прападобная Ефрасіння Полацкая”, “Праваслаўныя святы” з названай серыі былі адзначаны прэміяй “За духоўнае адраджэнне” 1997 г.

Графічны дызайн кнігі вызначаецца тэкстам, яго зместам. У супольнасці з аўтарамі Янкам Круком і Аксанай Катовіч У. Васюк стварае модульнае афармленне да беларускага народнага календара. На выставе былі прадстаўлены кнігі, аздобленыя мастаком да зімовых і вясновых святаў і аўтарскія графічныя ілюстрацыі да тэксту. Фармат кнігі выцягнуты па вертыкалі. У афармленні мастак выкарыстоўвае знак – зорку, якая сімвалізуе сусвет і надае выданню адметнасць і сувязь з народным мастацтвам Беларусі. Мастацтвазнаўцы і крытыкі адзначаюць мастакоўскую вобразнасць, пластычнасць, каларыстычнае і шрыфтавое адзінства ў афармленні кніг Уладзіміра Васюка [2].

Ілюстрацыі Уладзіміра Малахава да кнігі Эрнеста Ялугіна “Мсціслаўцаў посах” вызначаюцца высокім прафесіяналізмам мастака і пранікнёнай пластыкай. Дыпломам за лепшае мастацкае афармленне 1990 г. было адзначана выданне “Казкі братоў Грым” у афармленні У. Малахава. Ён вучыўся ў Васіля Шаранговіча, які меў вялікі ўплыў на студэнтаў, і амаль усе вядучыя мастакі-графікі Беларусі дзякуюць свайму настаўніку за той дакладны кірунак на творчы прафесіяналізм, высокі ўзровень і мастацкую якасць графікі. Як мастацкі рэдактар выдавецтваў “Беларуская Энцыклапедыя” і “Беларусь” У. Малахаў укладае ў выпуск кнігі не толькі веды, але і частку душы [3].

Уладзімір Вішнеўскі прадставіў на выставе ілюстрацыі да кнігі Міколы Нікалаева “Палата кнігапісная” (1993). Вялікі майстар афорту стварае непаўторныя візуальныя вобразы, якія побач з мастацкім словам “гучаць” удвая мацней. У. Вішнеўскі – аўтар графічных сімфоній “Прысвячэнне Караткевічу”, “Каменная ўсмешка” і серый афортаў да кніг “Вянок беларускіх народных песень”. Ён узнагароджаны многімі дыпломамі конкурсаў “Мастацтва кнігі”. Свой вопыт і ўменні ён перадае маладым мастакам, выкладаючы на кафедры графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў [4].

Вячаслаў Валынец прадэманстраваў на выставе ілюстрацыі да кнігі “Беларускія народныя казкі”. Аформленыя мастаком кнігі вядомы не толькі на радзіме, але і за межамі нашай краіны. Яны маюць вельмі высокі эстэтычны ўзровень. Працы Вячаслава Валынца захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі і іншых музеях краіны і за яе межамі. Многія гады майстар узнагароджваецца дыпломамі і прызамі на рэспубліканскім конкурсе “Мастак і кніга” [5].

На думку мастакоў і спецыялістаў у галіне афармлення кнігі, вельмі цікавым атрымалася супастаўленне ілюстрацый у аўтарскім выкананні (В. Валынца, У. Васюка, В. Славука, У. Вішнеўскага і У. Малахава) з вынікам іх паліграфічнага выканання. І гэта засведчыла, што друк не ўвабраў усе адценні колеру, якія мастак заклаў у арыгінале. Вельмі многа пакутаў патрабуе ад афармляльніка друкарская справа, калі пасля стварэння мастаком арыгінал-макета адбываецца тыражнае “нараджэнне кнігі”. Шкала адценняў у мастака на некалькі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

парадкаў шырэй, чым магчымасці друкарняў. Многія шрыфтавыя і графічныя аркушы застаюцца ў майстэрнях мастакоў і музеях краіны ў адзіным экзэмпляры ці ў аўтарскім выкананні.

Творчасць сучасных мастакоў-графікаў, працы якіх дэманстраваліся на выставе канферэнцыі “Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры”, адлюстравала той узровень афармлення і дызайну кнігі, які адпавядае сусветнаму.

**Заўвагі**

1. Славук Валерый Пятровіч нарадзіўся 7 красавіка 1947 г. у г. п. Коханава Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1977 г. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы. Кніжная графіка вызначаецца абвостраным успрыманнем літаратурнага зместу, эмацыяйным і глыбокім выяўленнем характараў герояў, своеасаблівасцяў сюжэтаў: народныя казкі “Удовін сын” (1977–1980), “Піліпка-сынок” і “Курачка Раба” (1983), “Людзей слухай, свой розум май” (1988), “Алёнка” (1989), “Златы птах” (1993); казка У. Ягоўдзіка “Лятучы цмок” (1995); кнігі “Касмалёт” М. Ганчарова, “Ад рэчыва да сутнасці” К. Шарыкава (1982), “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Я. Баршчэўскага (1990), “Вясна ўвосень” У. Караткевіча (2000) і інш.

2. Васюк Уладзімір Іванавіч нарадзіўся 2 ліпеня 1947 г. у пас. Леніна Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. Вядомы беларускі мастак – дацэнт кафедры Графічнага дызайну акадэміі мастацтва. Працуе ў галіне плаката, дызайна кнігі, у станковай і прыкладной графіцы. На выставе прадстаўлена серыя ілюстрацый да беларускага Народнага календара. Графічныя аркушы аб’яднаны ў цыклы пасезонна. Мастак падкрэслівае каларыстычна, пластычна і вобразна зімовыя, веснавыя і летнія святы. Кожны аркуш мае непаўторнае вырашэнне, але пры гэтым захоўваецца модульная сістэма графікі. На вокладках кніг і на аркушах мастак выкарыстаў пластычна вырашаны знак-зорку, якая сімвалізуе сусвет і надае выданню асабістую адметнасць і сувязь з Народным беларускім мастацтвам. За паслячарнобыльскі перыяд аўтар стварыў некалькі серый графічных станкавых аркушаў: “Прывіды маёй малой Радзімы”, “За ваколіцай”, “У бацькоўскім садзе”, “Восень”, “Прадчуванне”, “Цішыня”, “Самота”, “Палынь-97”, “Сустрэча” і інш. Станковая графіка майстра неаднаразова экспанавалася на выставах у Беларусі і за яе межамі. Надзвычай цікавая нізка графічных твораў, прысвечаных гісторыі Радзімы: “Уваход у храм”, “Вечны сон”, “Лад-Рагвалод”, “У калысцы дзяржаўнасці”, “Сівая памяць”, “Напрыканцы XX стагоддзя”, дыпціх “Адвечнае”. У апошнія пяць гадоў у мастака з’явілася нізка аркушаў знакава-філасофскага зместу: “Чаша соль зямлі”, “Чаша пакут”, “Чаша ўлонне”. Мастак – аўтар фірмовых стылявых рашэнняў БДУ, БДУ культуры і мастацтваў, знакамі якіх з’яўляюцца “Залаты папаратнік” і “Чароўная птушка”. На аснове знакаў мастак вырашае харугвы, гербы, сцягі названых навучальных устаноў краіны. Многія працы мастака, у тым ліку плакаты, захоўваюцца ў музеях краіны і замежжа. Творчасць У. Васюка – шматгранная і змястоўная старонка ў айчыннай культуры.

3. Малахаў Уладзімір Аляксеевіч нарадзіўся 20 лютага 1956 г. у с. Навараснянскае Луганскай вобласці (Украіне). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1980 г.). Вучыўся ў В. Шаранговіча, П. Любамудрава, А. Шэверава. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1976 г. Працуе ў кніжнай часопіснай і станковай графіцы. Асноўныя творы: ілюстрацыі да кніг “Мсціслаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цаў посах" Э. Ялугіна, "Казачны церам" С. Шушкевіча, "Выбранае" Ч. Айтматава, падручнікі "Буквар" і "Крынічка". Літаграфічныя лісты "Апошнія навіны", "Першы снег", "Песня пра зубра". Працаваў мастаком-радактарам выдавецтва "Беларусь" (1981–1985), мастаком-рэдактарам штодзённіка "Беларускае тэлебачанне і радые" (1987–1995), мастацкім рэдактарам газеты "Рэспубліка" (1995–2000). Узнагароджаны дыпломамі выставы-конкурса "Мастацтва кнігі", за лепшае мастацкае афармленне 1989–1990 гг. "Казкі братоў Грым", лаўрэат прэміі саюза журналістаў "Залатое пяро" (1999 г.), мастацкі рэдактар выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя", член БСМ з 1988 г., член Саюза журналістаў з 1999 г.

4. Вішнеўскі Уладзімір Мікалаевіч нарадзіўся 17 лютага 1955 г. у в. Балотчыцы Слуцкага р-на Мінскай вобл. У 1979 г. закончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З 1988 г. выкладае ў Беларускай акадэміі мастацтва. Працуе пераважна ў галіне станковай і кніжнай графікі. Выкарыстоўвае складаныя графічныя тэхнікі. Аформіў зборнік вершаў "Родныя вобразы" Я. Коласа (1982), выканаў ілюстрацыі да кніг "Вянок беларускіх народных песень" (1988), "Палата кнігапісная" М. Нікалаева (1993), "Янка і ружа" і "Ці вернецца князь Кук" У. Ягоўдзіка (абедзве 1993).

5. Валынец Вячаслаў Іванавіч нарадзіўся 2 ліпеня 1947 г. у в. Ятвезь Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Закончыў аддзяленне графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1977). Вучыўся ў П. Любамудрава, В. Шаранговіча. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1977 г. Працуе ў станковым жывапісе і кніжнай графіцы. Асноўныя творы ў кніжнай графіцы: ілюстрацыі да зборніка казак братоў Грым "Чарадзейная хатка" (1994); да казак народаў свету; да беларускіх ("Беларускія народныя казкі", 1993) і рускіх народных казак; да казак В. Гаўфа; афармленне і ілюстрацыі да дзіцячай Бібліі і інш. Яго работы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у музеі імя П. Масленнікава ў Магілёве, у прыватных колекцыях у Беларусі, Расіі, Літве, краінах Заходняй Еўропы – у Іспаніі, Партугаліі, Шатландыі, Англіі, Францыі, Германіі, Бельгіі, Швейцарыі, а таксама ў ЗША і Аўстраліі. Узнагароджаны дыпломамі рэспубліканскіх конкурсаў "Мастацтва кнігі". Сябра Беларускага саюза мастакоў з 1981 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ